# Вейкніс Бярнард Адольфавіч

**<u>Нідзяны: Бярнард Вейкніс</u>**

***Успаміны жыхаркі вёскі Тартак Галіны Дэнюш***.

*– Бацька мой Бярнард Адольфавіч Вейкніс. Нарадзіўся ў 1924 годзе на хутары Нідзяны. Хлопцам пайшоў на вайну – 20 гадоў меў. Як ад акупантаў вызвалілі нашы землі, так мужчын і сталі прызываць у войска,* ***– дзеліцца жанчына****. – Калі татку забралі, то мая бабуля пачала імшы ў касцёле закупляць, прасіла ў Бога, каб сына збярог. Затое, відаць, бацька жывым і застаўся!*

Наш зямляк трапіў у пяхотную дывізію, быў стралком 37-га палка.

*– Татка музыкантам добрым быў – граў на скрыпцы і спяваў вельмі прыгожа – часта выступаў перад аднапалчанамі,* ***– прыгадвае дачка франтавіка****. – Ведаю, што служыў разам з мясцовым хлопцам – Стакуном з Нідзян. Расказваў, што страшныя баі былі на тэрыторыі Польшы: Вісла і Одра былі ўсе ў крыві, вельмі шмат там людзей палягло!*



Як сведчыць вайсковая кніжка ветэрана, прызваны ён быў у лістападзе 1944-га, а дэмабілізаваны толькі ў лютым 1947 года – пасля вайны даслужваў тэрміновую службу.


Серия АП

в том, что он по освидетельствовании „6" апреля 1957 г.
комиссией при Островецким РВК (указать при
Молодечненской обл. каком РВК или воинской части)
признан негодным к несению воинской обязанности с исключением с учета по гр. „1" ст. „103-д" расписания болезней приказа МО СССР № 110 1956 года и снят с воинского учета.

2

Серия АП

Подлежит переосвидетельствованию
через

Личная подпись владельца

М. П.

Островецкий Районный Военный комиссар
майор (Кулаков)
(звание, фамилия)
Начальник части
(звание, фамилия)
„8" апреля 1957 года

3




Серия АП

ОТМЕТКИ
о переосвидетельствованиях

Медкомиссией Островецкого
РВК 30. 08 19__ г.
Признан не годным с исключением с учета
гр. „1" ст. „103-д" прик. МО
№ ___ 56 г.
Предкомиссии ___ Врачи:

4

Серия АП

Краткие сведения о прохождении службы в Советской Армии, Военно-Морских силах, пограничных и внутренних войсках МВД.

37 пехотный полк – стрелок
11.1944 г. – 27.02.1947 г.
Демобилизован на основании приказа главнокомандующего войска польского
11.02.47.
27.02.1947 г.
Островецкий райвоенком
(Колобов)

5

*– Бацьку прапанавалі заставацца жыць у Польшчы, але ён вярнуўся на Радзіму. Татавы бацька рана памёр, яшчэ да вайны, а ў Нідзянах яго чакалі сёстры і маці,* ***– гаворыць Галіна Дэнюш****. – Тут, у Быстрыцы, маму маю спаткаў, у Нідзянах хатку пабудаваў... А працаваў конюхам у калгасе імя Карла Маркса.*

Бярнард Вейкніс узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941-1945 гг.», «За Одар, Нісу і Балтыку», знакам Грунвальда, медалём Жукава.

*– Захаваліся ў мяне не ўсе татавы ўзнагароды,* ***– паказвае медалі Галіна Дэнюш,*** *– большасць тут юбілейныя. І падушачку для іх пашыла, і на сценку прымацавала – напамін пра бацьку ў мяне штодзень на вачах.*







Текст: Рита Дремо
https://www.ostrovets.by/news/novosti/news57926.html